вздачы», заслугоўвае ўсялякага ўхвалення. Можна, відаць, пагадзіцца з абгрунтаваным у манаграфіі крытэрыем маральнай годнасці даследчыка — уменнем у любых, самых неспрыяльных умовах праносіць «высокае і чыстае святло філасофскай культуры» (с. 277).

У манаграфіі пададзена вялікая ўвага асэнсаванню практыкі камуністычнага выхавання — праблеме мэтанакіраванага фарміравання і змянення суб'ектыўнага фактару, сацыяльнага рэгулявання ідэйнага жыцця і грамадскіх паводзін асобы. Высвятляецца роля працоўнай дзейнасці ў фарміраванні светапогляду, шляхі ўдасканальвання фарміравання светапоглядных прынцыпаў у працэсе навучання (у тым ліку шляхам больш эфектыўнага выкарыстання марксісцка-ленінскай філасофіі), разглядаюцца розныя аспекты ідэалагічнай дзейнасці.

Фарміраванне светапогляду арганічна ўвязваецца з маючым месца ідэалагічным процiборствам дзвюх сацыяльных сістэм. У прыватнасці, раскрываецца сутнасць так званай масавай культуры як ідэалагічнага сродку буржуазнага грамадства, аргументавана крытыкуюцца ідэалістычная антрапалогія і культуралогія, негатыўная дыялектыка Т. Адорно, філасофская канцэпцыя Э. Касірэра.

Нельга не пагадзіцца з вывадам аб тым, што «буржуазная філасофская культуралогія нашых дзён, як бы яе прадстаўнікі ні камуфліравалі яе сапраўдны стан, дэманструе зніжэнне ўзроўню разумення і інтэрпрэтацыі праблемы чалавека — «феномена чалавека» і «свету чалавека» (с. 238). У манаграфіі правільна падкрэслена, што ва ўмовах вострай ідэалагічнай барацьбы прынцыповае значэнне мае наяўная філасофская культура грамадства: для работнікаў у галіне прыродазнаўчых і грамадскіх навук удасканальванне іх філасофскай культуры з'яўляецца важнейшым імператывам дзейнасці (с. 246), прагрэс жа духоўнай культуры сацыялістычнага грамадства «ёсць адначасова і прагрэс філасофскай культуры кожнага яго свядомага члена, грамадства ў цэлым» (с. 245).

Не ўсе пастаўленыя пытанні атрымалі ў манаграфіі раўнацэнную глыбіню асэнсавання, а тым больш адназначнае, «адзінае і канчатковае» рашэнне. Уласна, такая мэта і не ставілася аўтарамі. Хутчэй, наадварот, аўтарскі калектыў лічыў патрэбным «не столькі адказваць на пытанні, колькі паставіць іх па магчымасці адэкватна» (с. 7).

На нашу думку, найбольш складаныя і важныя пытанні асветлены дастаткова. Рэцэнзуемая манаграфія, якая адрозніваецца прафесіянальнай культурай, строга арыентавана сваім глыбокім зместам, палемічным стылем і эмацыянальным зарадам на пераадоленне дагматызму ў мысленні і амаральнасці ў паводзінах, адказвае запытанням сучаснай эпохі, садзейнічае набліжэнню філасофіі да рэальнай практыкі камуністычнага будаўніцтва.

*Т. І. АДУЛА*

## ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ САВЕЦКАГА НАРОДА

Падрыхтаванае навуковым саветам «Гісторыя сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва ў СССР» Інстытута гісторыі АН СССР, Інстытутам гісторыі АН Малдаўскай ССР па матэрыялах праведзенай у 1985 г. Усесаюзнай канферэнцыі «Савецкі народ — новая сацыяльная і інтэрнацыянальная супольнасць людзей» выданне * прысвечана інтэрнацыянальнаму аспекту гісторыі савецкага народа.

У зборніку артыкулаў разглядаецца кола тэарэтычных і гістарычных праблем фарміравання савецкага народа як сацыяльнай і інтэрнацыянальнай супольнасці людзей. Аўтары сканцэнтроўваюць увагу на аналізе працэсаў унутрыінтэрнацыянальнага і міжнацыянальнага развіцця народаў СССР, міжрэспубліканскага супрацоўніцтва ва ўсіх галінах жыцця, пытаннях савецкай гістарыяграфіі, крытыкі буржуазных канцэпцый гісторыі нацыянальных адносін у СССР.

У прадмове акадэмік М. П. Кім адзначае, што станаўленне савецкага народа — заканамерны вынік развіцця сацыялістычных грамадскіх адносін. Працэс гэты складаны і супярэчлівы, звязаны з пераадоленнем сур'ёзных перашкод і цяжкасцей. Перад савецкімі гісторыкамі стаіць актуальная задача рашучай перабудовы ўсёй работы, праўдзівага даследавання гістарычных рэальнасцей, іх аб'ектыўнага аналізу, што магло б служыць надзейнай крыніцай развіцця навуковай тэорыі для практыкі сацыялістычных нацыянальных адносін.

Фарміраванню і развіццю новай сацыяльнай і інтэрнацыянальнай супольнасці — савецкаму народу прысвечаны артыкул С. С. Хромава. Пачатак гэтаму працэсу паклала Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Аўтар на аснове сістэмнага падыходу вылучае асноўныя фактары, якія садзейнічалі стварэнню савецкага народа: перамога сацыялістычнай рэвалюцыі, што забяспечыла правядзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі; утварэнне СССР; перамога сацыялізму, ліквідацыя няроўнасці народаў; фарміраванне на гэтай аснове сацыялістычных нацый і народнасцей; кіраўніцтва гэтым працэсам з боку рабочага класа і яго авангарда — Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Перадумовы станаўлення новай супольнасці людзей, праблемы яе інтэр-

---

* Советский народ — новая интернациональная общность людей. Кишинев, 1987. 279 с.

нацыяналізму, заканамернасці і асаблівасці змянення сацыяльнай, нацыянальнай структуры СССР разгледжаны С. В. Кульчыцкім, Л. В. Ліхалатам, Л. С. Каварскіх, Ю. А. Курносавым.

Далейшае развіццё дружбы і супрацоўніцтва народаў СССР у значнай меры залежыць ад паглыблення сацыялістычнай дэмакратыі, бо чым больш дэмакратычнае жыццё краіны, тым большая сіла ўзаемнага добраахвотнага прыцягнення працоўных усіх нацый і народнасцей. Лінія КПСС на ўдасканаленне савецкай дэмакратыі накіроўвае даследчыкаў на раскрыццё штодзённага актыўнага і дзейснага ўдзелу працоўных, іх калектываў і арганізацый у вырашэнні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця, аналіз развіцця палітычнай творчасці кожнай нацыі і народнасці і ўсёй іх брацкай садружнасці, паказ паслядоўнага ажыццяўлення прынцыпаў сацыялістычнага самакіравання шматнацыянальнага савецкага народа, адзінства правоў, свабод і абавязкаў грамадзян усіх нацыянальнасцей.

В. І. Царанаў і М. К. Сытнік спыняюцца на аналізе сацыялістычных ператварэнняў 40—50-х гадоў у савецкіх рэспубліках і абласцях, уз'яднаных з СССР у 1939—1940 гг., і далейшай кансалідацыі савецкага народа. Аб'ектыўныя заканамернасці і спецыфічныя асаблівасці, новыя рысы міжнацыянальных адносін у заходніх рэспубліках і абласцях СССР пераканаўча паказаны Л. Е. Рапідай.

Развіццё і ўзаемадзеянне нацый заўсёды складвалася і складваецца ў залежнасці ад эканамічных вытворчых адносін, існуючых у грамадстве. Эканамічнай сферы нацыянальных адносін гісторыкі традыцыйна надаюць значную ўвагу. У наш час, які характарызуецца пачаткам глыбокіх зрухаў у эканоміцы, адчуваецца патрэбнасць у спецыяльных работах аб сучаснай эканамічнай стратэгіі партыі, усебаковым уплыве прагрэсу эканомікі на развіццё і збліжэнне нацый, удасканаленне нацыянальных адносін.

Праблемы садружнасці савецкіх рэспублік у развіцці народнай гаспадаркі краіны і ўмацавання адзінства савецкага народа раскрыты Ф. А. Ахмедшчынай, В. І. Бузала, В. Г. Лапінай, І. М. Пякрасавай, К. Ю. Струмскісам, К. Ю. Хаецкім, Л. У. Юсупавым. Развіццё інтэрнацыяналізацыі вытворчасці цесным чынам, на думку аўтараў, звязана з паглыбленнем яго спецыялізацыі і кааперавання, што вызначае стварэнне ўсе больш устойлівых гаспадарчых і навукова-тэхнічных сувязей паміж рэспублікамі, арганізуе глыбока інтэграваную інтэрнацыянальную сістэму расшыранага ўзнаўлення ў маштабе ўсёй краіны. Пры гэтым спецыялізацыя спалучаецца з комплексным характарам эканомікі. Устаноўка XXVII з'езда КПСС на забеспячэнне гарманічнага развіцця ўсіх рэспублік накіроўвае вучоных на выяўленне найбольш эфектыўных шляхоў і сродкаў, якія садзейнічаюць вырашэнню гэтай задачы.

Аднак асвятляюцца гэтыя працэсы без належнага крытычнага аналізу ўсяго масіву гістарычных дакументаў. Вядома, што ў адзінаццатай пяцігодцы шырокае пашырэнне атрымалі недавыкананне і нават зрывы дагаворных абавязацельстваў па кааперараваных пастаўках прадукцыі і сыравіны. Не ў поўнай меры выкарыстоўваліся эканамічныя рэзервы сацыялізму. Вучоныя-гісторыкі сёння маюць значныя магчымасці не толькі для больш грунтоўнай характарыстыкі цяперашніх маштабаў і форм удзелу брацкіх народаў у развіцці прадукцыйных сіл, але і для выпрацоўкі надзейных рэкамендацый, якія садзейнічалі б пашырэнню і паглыбленню гэтага працэсу.

На матэрыяле розных рэгіёнаў краіны прааналізаваны сацыяльна-класавыя асновы новай супольнасці людзей. Роля рабочага класа як вядучай сілы станаўлення новай сацыяльнай і інтэрнацыянальнай супольнасці савецкага народа асветлена Э. Э. Янвяркам і Л. М. Лычом. Месца калгаснага сялянства ў гэтым працэсе адлюстравана П. П. Панчанкам і С. М. Цімчанкам. Пераадоленне класавых фарміраванняў сацыяльна аднароднага грамадства выступае як важная заканамернасць развіцця сацыяльных адносін у СССР на сучасным этапе, адзначаецца ў новай рэдакцыі Праграмы КПСС. Відавочна сувязь гэтага працэсу з праблемай збліжэння нацый, удасканалення нацыянальных адносін. Станаўленне бяскласавай структуры грамадства ўзмацняе сацыяльную аднароднасць нацый, садзейнічае фарміраванню агульных рыс культуры, маралі і быту, далейшаму ўмацаванню ўзаемнага давер'я і дружбы паміж імі.

Атрымалі асвятленне пытанні навукова-тэхнічнага і культурнага супрацоўніцтва. Гэта тэма закранаецца ў работах П. Ц. Петрыкава і Г. У. Карзенкі, І. Д. Мацюка, В. Ф. Панібудзьласка, Г. С. Брэгі, М. І. Дзмітрыевай, В. Н. Шайко, Г. Е. Трапезнікава, В. М. Корбу, Р. В. Даніленкі і інш. Навука як састаўная частка духоўнай культуры выступае магутным сродкам аб'яднання і збліжэння народаў, арэнай іх калектыўнай творчасці, вынікі якога ўмацоўваюць прагрэс кожнай нацыі і грамадства ў цэлым. Аўтары падкрэсліваюць, што асабліва вялікая яе роля ў сучасных умовах, калі інтэнсіфікацыя грамадскай вытворчасці, маштабы стваральнай дзейнасці савецкага народа патрабуюць удасканалення форм навуковага супрацоўніцтва.

Паглыбленню інтэрнацыяналізацыі навуковых даследаванняў і іх укараненню ў вытворчасць садзейнічаюць магутныя міжгаліновыя навукова-тэхнічныя комплексы, закліканыя забяспечыць у кароткі тэрмін выхад краіны на сусветны рубеж па важнейшых напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу. Ужо са сказанага вынікае, што развіццё сучаснай НТР ставіць перад даследчыкамі комплекс праблем, распрацоўка якіх будзе мець не толькі навуковае, але і практычнае значэнне для рацыяналізацыі міжнацыянальных сувязей, удасканалення нацыянальных адносін.

Артыкул Т. Ю. Красавіцкай і А. П. Ненарокава закранае малавывучаную праблему — сумесную выпрацоўку адзінай культурнай палітыкі наркаматамі РСФСР і УССР

у 1919 і 1920 гг. Эфектыўныя формы інтэрнацыянальнага выхавання працоўных і навучэнцкай моладзі прыводзяць А. І. Баюр і В. М. Гру.

Вялікая ўвага ў рэцэнзуемым зборніку нададзена развіццю міжрэспубліканскіх сувязей Савецкай Малдавіі. На цікавым фактычным матэрыяле асвятляюцца інтэрнацыяналізм працоўных рэспублікі ў барацьбе супраць фашысцкага акупацыйнага рэжыму (П. М. Шорнікаў), брацкая дапамога народаў СССР у аднаўленні і развіцці прамысловасці і транспарту МССР (В. І. Пасат), уклад Савецкай Малдавіі ў развіццё народнагаспадарчага комплексу краіны (К. В. Страціеўскі).

Г. Н. Тапузлу паставіў праблему ўдасканалення эканамічнай інтэграцыі ў сельскай гаспадарцы краіны. На прыкладзе Малдаўскай ССР даследуецца ўклад брацкіх саюзных рэспублік у ажыццяўленне механізацыі, электрыфікацыі, хімізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і пераводу яе на індустрыяльныя рэйкі. Аўтар аналізуе прычыны запавольвання развіцця аграпрамысловага комплексу на рубяжы 70 — пачатку 80-х гадоў.

Адзін з раздзелаў прысвечаны гістарыяграфічнаму і крыніцазнаўчаму аспектам разглядаемай праблемы. У ім закранаюцца вынікі вывучэння рэгіянальных сувязей народаў СССР у савецкай гістарычнай літаратуры (Н. В. Камарэнка); прымяненне матэматычных метадаў у даследаваннях па гісторыі савецкага народа (Т. Н. Слаўко). Аднак падобныя даследаванні пакуль вядуцца ў асноўным у тэарэтычным плане, што ўскладняе іх даследаванне пры падрыхтоўцы манаграфічных і абагульняючых работ. Канкрэтныя даныя, якія выкрываюць пазіцыі нашых ідэалагічных праціўнікаў па праблемах інтэрнацыяналізму, прыводзяцца ў артыкулах Б. Я. Пудзелса, Д. А. Віксны. Буржуазна-нацыяналістычныя канцэпцыі заходніх саветолагаў рэакцыйнай эміграцыі падвергнуты навуковай крытыцы С. А. Атамукасам.

Вырашэнне актуальных праблем нацыянальных адносін, якія вынікаюць з дакументаў і матэрыялаў XXVII з'езда КПСС, на ўзроўні высокіх патрабаванняў, што прад'яўляюцца партыяй да грамадскіх навук, будуць садзейнічаць сацыяльна-эканамічнаму і духоўнаму прагрэсу краіны, удасканаленню сацыялістычнага грамадства.

*Г. У. КАРЗЕНКА*

## У АДЗІНЫМ СТРАІ

Гістарыяграфія рэвалюцыйнага руху ў Беларусі налічвае нямала кніг і артыкулаў. Разам з тым доўгі час па-за полем зроку гісторыкаў рэспублікі знаходзілася такая важная праблема, як рэвалюцыйныя сувязі рабочых Беларусі з рабочымі іншых рэгіёнаў Расійскай дзяржавы. Спецыяльна яна не вывучалася. У адзінстве ж шматнацыянальнага пралетарыяту Расіі У. І. Ленін бачыў залог поспеху ў барацьбе з царызмам і капіталізмам.

Адставанне беларускай гістарыяграфіі ў распрацоўцы гэтай праблемы запоўнена рэцэнзуемай манаграфіяй *. Тэма сувязей атрымала ў ёй упершыню самастойнае гучанне. Аўтар дасканала валодае гістарыяграфіяй пытання, вядзе даследаванне лагічна, даступнай мовай. Вялікай вартасцю работы з'яўляецца яе разнастайная крыніцазнаўчая база. У манаграфіі шырока прадстаўлены зборнікі дакументаў, перыядычны друк, мемуары ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху. Аднак большасць звестак узяты з фондаў цэнтральных і мясцовых дзяржаўных архіваў. Шкада толькі, што аўтар не змог прааналізаваць ва ўводзінах крыніцы, абмежаваўшыся простым іх пералікам.

Структура кнігі пабудавана на перыядызацыі расійскага вызваленчага руху, якую даў У. І. Ленін. У першай главе даследуюцца прадпасылкі сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы шматнацыянальнага расійскага пралетарыяту. Яны разнастайныя. З іх У. Г. Філякоў вылучае важнейшыя: сацыяльна-эканамічныя і палітычныя. Удала выбраныя крыніцы — матэрыялы ўсерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г. і гандлёва-прамысловых абаротаў 1900 г.— дазволілі яму даволі пераканаўча паказаць, што Беларусь на рубяжы двух стагоддзяў з'яўлялася неад'емнай часткай усерасійскага капіталістычнага рынку. Яе тавары (уключаючы рабочыя рукі) цыркулявалі па ўсёй краіне. Так, па даных перапісу 1897 г., у Пецярбургу працавала амаль 25 тыс. ураджэнцаў з пяці заходніх губерняў, у Маскоўскай губерні — каля 7,5 тыс., на Украіне — 33,2 тыс., у Прыбалтыцы — 20,6 тыс. Беларусы працавалі таксама ў Закаўказзі, у іншых рэгіёнах Расіі. Усё гэта аб'ектыўна садзейнічала ўзмацненню эканамічных сувязей, збліжэнню народаў Расіі, іх сумеснай рэвалюцыйнай барацьбе. Аўтар правільна адзначае, што пралетарыят Беларусі фарміраваўся як адзін з атрадаў шматнацыянальнага расійскага пралетарыяту.

У цэнтры кнігі знаходзяцца пытанні рэвалюцыйных сувязей і баявой садружнасці пралетарыяту Беларусі з рабочымі ўсёй краіны. Ім прысвечаны дзве главы з трох. Адна ахоплівае перыяд 1895—1904 гг., другая — 1905—1907 гг.

Рэвалюцыйныя сувязі разглядаюцца аўтарам у развіцці. У 90-х гадах XIX ст. яны праяўляліся ў асабістых кантактах паміж асобнымі перадавымі рабочымі, прафесійнымі рэвалюцыянерамі. Заканамерным вынікам узмацнення рэвалюцыйных сувязей паміж

* Филяков В. Г. Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX — начале XX в. Мн.: Наука и техника, 1987. 142 с.